РЭВЕРС НА АВЕРС

Украіна праяўляе цікавасць да паставак нафты з Венесуэлы у Беларусь

Паміж намі, суседкамі, шмат агульнага — і межы, і гісторыя, і планы на будучыню. Наша ўзаемадзеянне куды больш глыбокае, чым проста ўзаемныя матэрыяльныя інтарэсы. Гэта нейкая ментальная супольнасць. І гуманітарны аспект супрацоўніцтва заўжды вельмі моцны.

— Нам хацелася б, каб беларуская мова, літаратура, культура, былі больш актыўна прадстаўленыя, прыкметныя ва Украіне, — зазначыў **пасол Украіны ў Беларусі Ігар ЛІХОВЫ** падчас сустрэчы з журналістамі. — Летась адкрыты Цэнтр беларускай культуры і мовы ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі. Сёлета, я ў гэта веру, у Кіеве будзе адкрыты помнік Уладзіміру Караткевічу.

Ён рызыкуе з'явіцца ва ўкраінскай сталіцы нават раней, чым у беларускай...

Двухбаковыя кантакты на палітычным узроўні таксама абяцаюць быць цеснымі і трывалымі. У хуткім часе чакаецца візіт у Беларусь нядаўна абранага прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча. Адметна, што нашу дзяржаву ўкраінскі лідар наведае адной з першых. Мінск стане трэцяй па ліку сталіцай у графіку міжнародных візітаў кіраўніка украінскай дзяржавы — пасля Брусэля і Масквы. Гэты факт украінскі дыпламат ацэньвае як «вельмі станоўчы сігнал».

На гэты год, паводле яго слоў, намечаныя маштабныя планы — аднавіць той рэкордны ўзровень тавараабароту, які быў дасягнуты ў 2008 годзе (летась жа ён скараціўся на 38 адсоткаў і склаў каля трох мільярдаў долараў, да канца года падзенне сышло на нуль, а ў студзені-лютым 2010 года назіраўся значны рост). Вырашыць шэраг пытанняў па ўмацаванні базы для стварэння сумесных прадпрыемстваў.

— Вельмі важна адстаяць сваю пазіцыю перад ЕС у праграме Усходняга партнёрства, дзе ўсе павінны быць роўныя, арганізаваныя, адказныя, — мяркуе кіраўнік дыпмісіі.

У рамках партнёрства ён згадаў праекты экалагічнага, культурнага плана, па забеспячэнні транспартных камунікацый у галіне энергетычнай бяспекі.

Паводле слоў дыпламата, Украіна бачыць свой інтарэс у пастаўках нафты з Венесуэлы ў Беларусь. Ён мяркуе, што гэта стане прадметам дэталёвага абмеркавання падчас чарговага пасяджэння міждзяржаўнай камісіі. А сам танны шлях нафты з порта Адэса на беларускія НПЗ, на думку дыпламата, пралягае праз трубаправод «Адэса—Броды».

— Ён не патрабуе ніякіх асаблівых тэхнічных зменаў і грашовых уліванняў. Варта толькі атрымаць гарантыю паступлення нафты і пераключыць у аверсны рэжым.

Дарэчы, гэты рэжым ужо апрабаваны: летась упершыню трубаправод «Адэса—Броды» запрацаваў па адной лініі і ў аверсным рэжыме.

Альтэрнатыва — чыгуначны шлях. Пасол не выключае пры гэтым, што Беларусь атрымае права на тарыфныя льготы пры транспарціроўцы, аднак заўважае, што гэта пытанне не столькі дыпламатыі, колькі эканомікі, транспартнага сектара. Кіраўнік дыпмісіі адзначыў таксама, што ўкраінскія НПЗ не загружаныя і тут ён таксама бачыць магчымасці для супрацоўніцтва з беларускім бокам.

— Дыверсіфікацыя энергапаставак — гэта не абавязкова адмоўны адказ сваім папярэднім партнёрам, — адзначае дыпламат. — Гэта перш за ўсё павышэнне гарантыі бяспекі сваёй краіны — і эканамічнай, і энергетычнай. Слова «дыверсіфікацыя» сёння не толькі моднае, але і надзвычай актуальнае.

У энергетычнай сферы ёсць зацікаўленасць таксама ў пастаўках электраэнергіі ў Беларусь, гэтак жа, як і ў транзіце ў Літву. Яны застаюцца вельмі важным кірункам супрацоўніцтва, на думку пасла. «У Беларусі ёсць свае погляды — яна хацела б быць не толькі звяном, якое звязвае, але і ўдзельнікам працэсу», — падкрэслівае дыпламат. Ён канстатуе, што ва Украіны ёсць і іншыя шляхі пастаўкі электраэнергіі ў Літву — праз Польшчу ці Расію, аднак прызнаецца таксама, што шлях праз Беларусь «для нас застаецца вельмі перспектыўным, ўзаемакарысным і надзейным».

А ў адваротным боку — з Беларусі ва Украіну — пойдзе цукар. Сёння Украіна мае патрэбу ў такой прадукцыі, і на думку пасла, вельмі добра, што «гэта часовая патрэба накладаецца на магчымасць паставак з Беларусі». Навошта закупляць здалёк, калі гэта з лішкам ёсць у суседняй краіне, — задаецца рэзонным пытаннем дыпламат. Гутарка ішла аб пастаўках 100 тыс. тон беларускага цукру ва Украіну. Справы суседскія, справы двухбаковыя...

Зоя ВАРАНЦОВА.

ЕЎРАЗОНУ ЛІХАМАНІЦЬ. ЧАСОВА ЦІ НАДОЎГА?

Згэтым і шэрагам іншых пытанняў на тэму ўзніклага сёлета напружання ў зоне еўра наш карэспандэнт звярнуўся да эканаміста і аналітыка, члена Кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. Заікі.

— Леанід Фёдаравіч, яшчэ зусім нядаўна шырокай публіцы ў Беларусі сітуацыя ў Еўрапейскім саюзе і становішча з яго адзінай валютай здаваліся надзейнымі, стабільнымі, а сам саюз нібы маналітным і згуртаваным вакол ідэі еўрапейскай інтэграцыі. Аднак апошнія падзеі паказалі: Еўрасаюз поўны вострых супярэчнасцяў і складаных праблем, у прыватнасці, становішча яго еўра сёння паўсюдна выклікае заклапочанасць. Адкуль бяда прыйшла?

— Не зусім згодны з вамі. Еўрапейскі саюз — дэмакратычная арганізацыя, і ўжо па гэтай прычыне саюз не можа быць, як вы сказалі, маналітным. Там кожная краіна мае права вета пры прыняцці тых ці іншых рашэнняў. Па другое, ЕС — арганізацыя з розным узроўнем і хуткасцю інтэграцыі. Так, сёння не лепшыя часы перажывае еўразона, яе ліхаманіць, аднак яна мае і шмат бясспрэчных дасягненняў. Але не пра іх сёння гаворка.

Цяперашнія праблемы еўразоны шмат у чым звязаныя і з тым, што ў ЕС жывуць розныя людзі. І цяжкасці з грашыма чамусьці ўзнікаюць пераважна ў тых, хто жыве ў цёплых краінах: Грэцыі, Партугаліі, Іспаніі. Чаму? Цікавы адказ на гэта пытанне даў лідар расійскіх ліберал-дэмакратаў, вядомы палеміст Жырыноўскі, які сказаў, што ў цёплых краінах людзі не вельмі любяць працаваць. Дарэчы, тэзіс зусім не новы, ён адпавядае пастулатам тэорыі ўзнікнення багатых і бедных краін. Сапраўды, жыццё на маляўнічых берагах Эгейскага ці Міжземнага мора сярод апельсінавых і мандарынавых садоў, плантацый вінаграднікаў, смуглявых прыгажунь — не лепшы стымул для штодзённай напружанай працы. І, відаць, невыпадкова цёплыя краіны аказаліся слабым звяном у фінансава-эканамічнай сістэме Еўрасаюза.

— Грукнула ў цёплых краях, а моцным рэхам адгукнулася па ўсім кантыненце. Хоць еўразона ахоплівае далёка не ўвесь еўрапейскі кантынент. Чаму такі разбуральны эфект?

— У еўразоне сканцэнтраваны асноўны эканамічны патэнцыял кантынента. Тут трэба сказаць некалькі слоў пра тое, што ўяўляе еўразона. У 1999 годзе ў яе ўвайшлі 11 еўрапейскіх краін, іх агульнай афіцыйнай валютай стала еўра. Прычым, у еўразону тады ўступілі тры самыя эканамічна моцныя і палітычна ўплывовыя дзяржавы: Францыя, Германія і Італія. Цяпер еўразона аб'ядноўвае 16 з 27 краін Еўрапейскага саюза. Яны маюць права выпускаць еўра: манеты і банкноты. Еўрапейскі цэнтральны банк (ЕЦБ) адказвае за грашова-крэдытную палітыку краін еўразоны: Аўстрыі, Бельгіі, Фінляндыі, Францыі, Германіі, Грэцыі, Ірландыі, Італіі, Кіпра, Люксембурга, Іспаніі, Славеніі, Славакіі, Партугаліі, Нідэрландаў і Мальты. Еўра стала адзінай валютай больш чым для 300 мільёнаў еўрапейцаў. У зону еўра маюць права ўвайсці ўсе члены ЕС, але не ўсіх запрашаюць.

> **У ЕС спрачаюцца і канфліктуюць па розных прычынах: сельскагаспадарчых, гандлёвых, фінансавых, як цяпер.**

— Якое значэнне пры прыняцці ў еўразону мае ступень эканамічнага развіцця краіны. Вызначальнае?

— Далёка не заўсёды. Заўважце, сярод краін еўразоны знаходзіцца Славакія, але няма Чэхіі. Чаму? Яна заўсёды была і пакуль застаецца больш эканамічна развітай, чым Славакія. А чэхі не хочуць уваходзіць у зону еўра, бо ім гэта нявыгадна: у Чэхіі пастаянна ідзе працэс рэвальвацыі (падаражэння ці ўмацавання) яе нацыянальнай валюты. Калі яшчэ адносна нядаўна за адзін долар ЗША давалі амаль 40 крон, то цяпер ужо 18 крон! У чэхаў унікальная грашова-эканамічная сітуацыя. Сёння, калі курс еўра падае адносна долара, то Чэхіі няма сэнсу пераходзіць на еўрапейскую валюту. Не спяшаюцца ў еўразону таксама Данія і Нарвегія.

— Аднак і англічане не адмовіліся ад свайго фунта стэрлінгаў. Яны прадбачылі будучыя праблемы з еўра?

— Не ўпэўнены. Так, яны захавалі фунт, але гэту прывілею ім Еўрасаюз дазволіў з улікам так званай астраўной псіхалогіі брытанцаў, іх часам гіпертрафаванай адданасці векавым традыцыям, спецыфікі іх менталітэту і звычак. Адным словам, англічане, с-э-эр.

— Сёння асобныя гарачыя еўрапейскія галовы нават прапаноўваюць на пэўны перыяд вярнуцца да мілых сэрцу немцаў маркі, французаў — франка, італьянцаў — ліры. Такое верагодна?

— Толькі ў страшным сне. Гэтая трагічная памылка стала б пачаткам развалу Еўрапейскага саюза, увогуле эканамічнай бядой для ўсіх еўрапейцаў, у тым ліку і жыхароў Беларусі. Ды і агульная перспектыва чалавецтва ў пераходзе на некалькі моцных рэгіянальных валютных зонаў. Такая няўмольная логіка развіцця глабалізацыі, якую можна ўсяляк крытыкаваць, «чысціць», ганьбіць, але не супыніць.

— У ЕС гучаць прапановы аб стварэнні Еўрапейскага валютнага фонду — ЕВФ. Гэта што за мера такая? Еўрапейская альтэрнатыва Міжнароднаму валютнаму фонду?

— Гэта адна з прапаноў, накіраваных на захаванне стабільнасці еўразоны. Гэты фонд будзе выконваць, вобразна кажучы, функцыі пажарнай фінансавай каманды. Не трэба разглядаць стварэнне ЕВФ як нейкую супрацьвагу МВФ, у якім правяць баль амерыканцы. ЕВФ — гэта свайго роду велізарная заначка, рэзерв на непрадбачаныя абставіны. Вядома, на ідэю стварэння фонду ЕС Брусэль «натхнілі» падзеі ў Грэцыі і Партугаліі, пераддэфолтная сітуацыя ў першай, пагроза ланцуговай негатыўнай рэакцыі ў іншых краін.

— Сёння ў ЕС шмат гавораць пра неабходнасць дапамагчы Грэцыі, а грошай не даюць. Канцлер ФРГ Ангела Меркель ясна дала зразумець, што Германія гатовая абмяркоўваць механізмы выратавання Грэцыі, але ёй пакуль не варта разлічваць на істотную фінансавую падтрымку. А тым часам у Афінах збіраюцца звярнуцца па дапамогу ў Міжнародны валютны фонд, грэкі ўсё часцей з настальгіяй узгадваюць сваю колішнюю валюту — драхму.

— Што зробіш, былое часта ўспамінаецца ў ружовым святле. Ім бы, грэкам, лепш бы думаць у свой час пра тое, як бы не парушаць падпісаны імі пакт аб стабільнасці і эканамічным росце краін ЕС — дакумент, які абавязвае ўрады краін быць абачлівымі ў фінансавых пытаннях. Ці, прасцей кажучы, з розумам выкарыстоўваць грошы. Галоўная ўмова пакта — няўхільна прытрымлівацца шэрагу абмежаванняў: штогод дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту і інфляцыя не павінны перабольшваць трох працэнтаў, дзяржаўны доўг не можа быць большым за 60 працэнтаў ВУП.

— А як там, «на зоне», утвараецца дэфіцыт бюджэту?

— Ён узнікае па-рознаму. А часцей з-за таго, што тая ці іншая дзяржава пачынае траціць грошай больш, чым збірае падаткаў. Нярэдка дэфіцыт бюджэту ўтвараецца ў выніку рэалізацыі высакародных намераў, напрыклад, з-за жадання плаціць пенсіі вышэй за фінансавыя магчымасці краіны. Скажам, прыходзіць міністр па працы і сацыяльных пытаннях да кіраўніка ўрада і кажа: «Шаноўны дружа прэм'ер, няма грошай на выплату чарговай пенсіі. Усё праелі. Ды і зарплату трэба павысіць, абяцалі ж народу...». Той моцна злуецца, але грошы неяк знаходзіць — скарачае іншыя выдаткі, напрыклад, на адукацыю, ахову здароўя, дарогі, бярэ грошы ў крэдыт у банках.

Гэта як з адпускнымі: часам чалавек іх бяздумна траціць у першыя два тыдні адпачынку, а потым думае, як дацягнуць да авансу. Хутка даводзіцца пазычаць у суседа, сваяка. Вось прыкладна так узнікае дэфіцыт бюджэту. Дарэчы, пакт аб стабільнасці пры ўступленні ў еўразону кляліся выконваць усе яе члены, але потым некаторыя пачалі грашыць, падпраўляць статыстыку, штучна завышаць сваю плацежаздольнасць, і тым самым ставіць пад пагрозу стабільнасць еўра, асновы еўрапейскай інтэграцыі. Еўразону будзе ліхаманіць, пакуль усе яе ўдзельнікі не пачнуць аднолькава ўважліва ставіцца да выканання сваіх грашова-крэдытных абавязкаў.

А сёння з-за крызісу ўжо амаль кожная краіна зоны еўра ў той ці іншай ступені парушае межы дэфіцыту бюджэту. Аднак буйныя і развітыя эканомікі зоны еўра робяць усё магчымае, каб не дапусціць рост бюджэтнага дэфіцыту і ўжо тым больш не хаваюць інфармацыю пра перавышэнне ўсталяванай пактам трохпрацэнтнай планкі. Абсалютна іншая сітуацыя склалася ў Грэцыі, дзе перавышэнне дапушчальнага паказчыка дэфіцыту стала нормай, а не выключэннем.

— Складваецца ўражанне, што наспявае канфлікт паміж Германіяй і шэрагам краін ЕС. Ці так гэта?

— Такі канфлікт існуе не першае дзесяцігоддзе. Проста мы пра гэта раней мала ведалі. Увогуле ў ЕС спрачаюцца і канфліктуюць па розных прычынах: сельскагаспадарчых, фінансавых, як цяпер, там час ад часу разгортваюцца «гандлёвыя» войны. Германія, як самая развітая і багатая еўрапейская краіна, робіць і самы вялікі ўнёсак у бюджэт ЕС. Скажу больш: Германія цягне на сабе ўсю эканоміку ЕС. Таму яна ўважліва сочыць за разумным і ашчадным размеркаваннем бюджэтных сродкаў, хваравіта рэагуе на парушэнні фінансавай дысцыпліны асобнымі саюзнікамі. А сёння з-за безадказных паводзінаў Грэцыі немцы, хутчэй за ўсё, будуць вымушаныя дзеля выратавання еўра выдаткаваць грошы з бюджэту Германіі на выцягванне легкадумных нашчадкаў старажытнай Элады з фінансавай ямы. Ужо падлічана, што кожны немец павінен будзе на гэта «адшпіліць» у сярэднім тысячу еўра, каб набыць даўгі Грэцыі. Сума вялікая нават для багатай ФРГ.

— Лаўрэат Нобелеўскай прэміі Роберт Мандэл, якога часам называюць «бацькам» адзінай еўрапейскай валюты, лічыць, што ЕС рэальна пагражае не Грэцыя, а Італія. Яна, маўляў, таксама мае велізарныя даўгі.

— Сутнасць у тым, што лічыць праблемай. Згодна з пактам аб стабільнасці, дзярждоўг не павінен быць вышэйшым за 60 працэнтаў. Што такое дзярждоўг? Напрыклад, калі гадавы аб'ём валавога ўнутранага прадукту (ВУП) у Беларусі складае 45 млрд долараў ЗША, то, па стандартах Еўрасаюза, дапушчальная планка дзярждоўгу для нас будзе ў межах 27 млрд. У ЗША дзярждоўг увогуле астранамічны, і нічога, жывуць сабе. Не хапае долараў, могуць трохі надрукаваць.

— Еўразону ліхаманіць. А як на гэтым фоне адчувае сябе зона долара?

— Доларавая зона куды больш сталая, яна існуе з 1850 года, і леташні фінансавы крызіс, вядома, моцна пашкуматаў яе, але не парушыў. У еўразоне некалькі іншая сітуацыя і зусім нядоўгая гісторыя існавання, няпэўны сённяшні дзень. Грэцыю могуць нават выключыць з зоны еўра, што акажа негатыўны ўплыў на адзіную еўрапейскую валюту, яе курс можа зваліцца ніжэй за долар. У выніку яго зона стане больш моцнай і ўплывовай. А гэта і Лацінская Амерыка, і Карыбы, і Цэнтральная Амерыка, і часткова Афрыка, дзе долар шырока выкарыстоўваецца. Яго паважаюць і ў Аўстраліі, і ў Кітаі, які свае валютныя рэзервы трымае пераважна ў доларах ЗША. Не дзіўна, бо долар выконвае функцыю сусветнай валюты. А еўра ўсё ж рэгіянальная валюта. І гэта варта не забываць.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Матэрыяльная дапамога будзе аказана і маці, і прыёмным дзецям

З Магілёўскага раёна з набалелым звярнулася жыхарка адной з вёсак. Яны з мужам — пенсіянеры. Калісьці дастаткова даўно ўсынавілі дваіх дзяцей, на якіх дагэтуль атрымліваюць дзяржаўную дапамогу. Вось наконт памераў апошняй і наракала жанчына. А ўвогуле, зразумела, гаворка вялася адносна матэрыяльных праблемаў сям'і.

— На дваіх з мужам мы цяпер атрымліваем мільён пяцьдзясят тысяч рублёў пенсіі. Памер дапамогі на дзяцей летась складаў 576 тысяч у месяц на дваіх. З гэтага года дапамога павялічылася літаральна на дзве тысячы рублёў у месяц на кожнага, значыць, дзяржава дабавіла ім у суме чатыры тысячы. Яны вучацца ў каледжы, ездзяць кожны дзень дадому, а гэта ж грошы. Абодва хворыя на бранхіяльную астму, значыць, патрэбныя лекі. Як можна пражыць на такія грошы? — гаварыла нам заяўніца.

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Сацыяльна-педагагічны цэнтр Магілёўскага раёна» Наталля ГУРКОВА пацвердзіла, што, сапраўды, са студзеня гэтага года пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь памер штомесячнай дапамогі быў павялічаны да 580 тысяч рублёў на дваіх. На атрыманне штомесячнай адраснай дапамогі сям'я разлічваць не можа, паколькі яна даецца, калі даход у месяц на аднаго члена сям'і не перавышае на сёння 255 220 рублёў. А нават крыху больш бацькі атрымліваюць пенсіі. Было б выйсцем атрымаць хоць бы аднаразовую дапамогу, для налічэння якой даход на члена сям'і не павінен быць большым за 382 830 рублёў. Аднак праблема ў тым, што дзеці па апецы пры вылічэннях гэтага грашовага мінімуму не ўлічваюцца...

Наталля Віктараўна аператыўна звязалася з кіраўніцтвам каледжа, дзе вучацца дзеці. Высветлілася, што тыя там бясплатна атрымліваюць раз на дзень гарачае харчаванне.

— Сацыяльны работнік навучальнай установы праз майстра прафесійнага навучання перадала дзецям, каб тыя напісалі заявы на аказанне ім аднаразовай матэрыяльнай дапамогі з боку каледжа. Гэта пытанне будзе ў іх на кантролі. Абяцалі выплаціць адну-дзве базавыя велічыні кожнаму, — распавяла нам Наталля Гуркова. — Акрамя таго, калі каледж атрымае гуманітарную дапамогу, навучэнцам абавязкова нешта з яе выдзеляць. Вось толькі шкада, як патлумачылі мне ў навучальнай установе, што апошнім часам «гуманітаркі» там не бачылі.

У гэты ж дзень з нашай чытачкай асабіста звязалася **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага райвыканкама Наталля ШАМШУРА**.

— Жанчыне прапанавана напісаць заяву на атрыманне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі з фонду сацыяльнай абароны (максімальны памер якой можа складаць 250 тысяч рублёў) — як непрацуючай пенсіянерцы, — паведаміла Наталля Яўгенаўна. — Акрамя таго, яна не адмовілася прыняць гуманітарную дапамогу. Праўда, пакуль яна яшчэ не паступала да нас, магчыма, гэта будзе ў наступным месяцы. У любым выпадку ваша заяўніца атрымае яе адна з першых.

Ад рэдакцыі. Для ўсіх работнікаў органаў сацыяльнай абароны характэрнай рысай з'яўляецца не толькі прафесіяналізм, але і звычайная чалавечая спагадлівасць. У гэтым выпадку мусім адзначыць выключную аператыўнасць і добразычлівасць Наталлі Віктараўны і Наталлі Яўгенаўны ў вырашэнні праблемы нашай заяўніцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Аўтакрама ў вёсцы Касцяшы Уздзенскага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кватэрнае пытанне

У склад маёмасці ўключаецца...

Сёлета падыходзіць наша чарга на будаўніцтва кватэры ў ЖБК. Вядома, што пры ўключэнні сям'і ў спісы на льготнае крэдытаванне ўлічваецца сукупны даход сямейнікаў і іх маёмаснае становішча. А як яно вызначаецца?

В. МАЦЕЕЎ, *г. Мінск.*

Дзейным заканадаўствам вызначана, што пры аднясенні грамадзян да катэгорыі тых, хто мае права на атрыманне льготных крэдытаў, субсідый і іншых формаў дзяржаўнай падтрымкі (і адпаведна — на ўключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне) акрамя сукупнага даходу ў сям'і павінна ўлічвацца і маёмаснае становішча гэтай сям'і. У прыватнасці, на атрыманне льготнага крэдыту могуць прэтэндаваць грамадзяне, якія валодаюць заяўленай маёмасцю, агульны кошт якой не перавышае двухразовага гранічнага памеру льготнага крэдыту для гэтай сям'і.

Для аднясення грамадзяніна да катэгорыі малазабяспечаных ім падаюцца звесткі пра сукупны даход і маёмаснае становішча сям'і ў орган, у якім ён знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па адзінай форме, што зацверджана ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

У склад маёмасці сям'і, якая ўлічваецца, уключаюцца прыналежныя на праве ўласнасці:

жылыя дамы з надворнымі пабудовамі, дачы і садовыя домікі, гаражы, гаспадарчыя і складскія памяшканні, іншыя збудаванні і не завершаныя будаўніцтвам аб'екты, кватэры, у тым ліку тыя, што знаходзяцца ў іншых населеных пунктах, а таксама іх часткі (долі);

транспартныя сродкі (акрамя мапедаў, веласіпедаў і гужавога транспарту), кошт кожнага з якіх перавышае 35-разовы памер зацверджанага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з 4 чалавек, які дзейнічае на дату падачы дакументаў для ўключэння ў спісы на атрыманне льготнага крэдыту і (або) на дату падачы дакументаў на атрыманне субсідыі, за выключэннем спецтранспарту, набытага ў адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі праз органы сацыяльнай абароны бясплатна або на льготных умовах.

Віктар САВІЦКІ.

В публикации годового баланса Общества за 2009 год ОАО «Минсклифт»
(в газете «Звязда» № 58-59 от 30.03.2010) в пунктах 3, 4 читать:

3. Начислено на выплату дивидендов	млн руб.	21	-
4. Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	55,9847	-

ОАО «ДСТ № 2, г. ГОМЕЛЬ» извещает акционеров, что срок выплаты дивидендов за 2009 год, установленный собранием акционеров, **30 апреля 2010 г.**

УНП 400022426

СТАЛІЦА ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ЭКАНОМНЫ РЭЖЫМ

У Мінску завяршыўся перавод адміністрацыйных і грамадскіх будынкаў у рэжым працаплівання. Гэта значыць, што тэмпература ў іх павінна быць ноччу і ў выхадныя дні не больш за +12, а ў рабочы час ацяпленне ўключаецца ў камфортным рэжыме. Пра гэта паведаміў на нарадзе ў гарвыканкаме начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў Ігар Тур. Месцы агульнага карыстання ў жылых дамах зусім адключаюцца ад цеплазабеспячэння.

Святлана ФРАЛЯНКОВА,
«Мінск—Навіны».

Дзяржаўтаінспекцыя інфармуе!

1 красавіка, у сувязі з правядзеннем мерапрыемстваў, з 10.00 да 14.00 будзе забаронены рух усіх відаў транспарту на ўчастку аўтадарогі М-1/Е-30 Брэст (Казловічы) — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі з км 332 (развязка з аўтадарогай Р-1 Мінск — Дзяржынск) па км 347 (развязка з аўтадарогай Р-23 Мінск — Мікашэвічы).

У сувязі з гэтым будзе забаронены з'езд з аўтадарогі Р-1 на аўтадарогу М-1 у кірунку мяжы РФ, з аўтамабільнай дарогі Р-23 у кірунку Брэста, а таксама рух у кірунку Брэста ад развязкі з аўтадарогай Р-23.

Аб'ехаць закрыты ўчастак можна будзе па аўтадарогах Р-1 Мінск — Дзяржынск, М-9 Кальцавая дарога вакол Мінска, Р-23 Мінск — Мікашэвічы і Р-65 Заслаўль — Дзяржынск — Возера.

— Перад пачаткам аб'ездаў закрытага для руху ўчастка будуць устаноўлены адпаведныя дарожныя знакі, якія ўкажуць маршруты аб'езду, — паведаміў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела арганізацыі дарожнага руху УДАІ МУС Беларусі Андрэй ІВАНОЎ**. — На акрэсленых участках дарогі рэгуляваць рух будуць супрацоўнікі ДАІ. Просім прабачэнне за часовыя нязручнасці.

Надзея ДРЫЛА.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «АГРОЛИЗИНГ» ПО СОСТОЯНИЮ НА 01.01.2010

Учетный номер плательщика – **190738158**
Вид деятельности – **Финансовый лизинг**
Организационно-правовая форма – **Открытое акционерное общество**
Орган управления – **Юридическое лицо без ведомственной подчиненности**
Адрес – **Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, дом 24, офис 907**
Сведения о государственной регистрации – **зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 20.07.2006 № 1423 в ЕГР юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190738158**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 г. млн руб.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость	101	390	1 570
амортизация	102	102	195
остаточная стоимость	110	288	1 375
Нематериальные активы			
первоначальная стоимость	111	-	10
амортизация	112	-	1
остаточная стоимость	120	-	9
Доходные вложения в материальные ценности			
первоначальная стоимость	121	11 624	1 192
амортизация	122	-	-
остаточная стоимость	130	11 624	1 192
Вложения во внеоборотные активы	140	37 716	113 497
В том числе: незавершенное строительство	141	64	789
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**49 628**	**116 073**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	6 068	28 288
В том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	101	67
животные на выращивании и откорме	212	-	-
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	-	-
расходы на реализацию	214	-	-
готовая продукция и товары для реализации	215	-	-
товары отгруженные	216	3 279	7 613
выполненные этапы по незавершенным работам	217	-	-
расходы будущих периодов	218	2 688	20 608
прочие запасы и затраты	219	-	-
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	14 559	29 183
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более, чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	82 547	201 118
В том числе: покупателей и заказчиков	231	82 547	201 118
прочая дебиторская задолженность	232	-	-
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	41 626	26 560
В том числе: покупателей и заказчиков	241	5 928	9 646
поставщиков и подрядчиков	242	35 586	16 814
по налогам и сборам	243	34	55
по расчетам с персоналом	244	9	41
разных дебиторов	245	69	43
прочая дебиторская задолженность	249	-	-
Расчеты с учредителями	250	-	-
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	-	-
прочие	252	-	-
Денежные средства	260	2 938	1 290
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	1 400	662
Финансовые вложения	270	56 401	23
Прочие оборотные активы	280	-	-
ИТОГО по подразделу II	**290**	**204 139**	**286 501**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**253 767**	**402 574**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ Уставный фонд	410	600	1 500
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	-
Резервный фонд	420	1	7
В том числе: Резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	1	7
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	-	-
Добавочный фонд	430	-	48
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	-
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	1 107	2 314
Целевое финансирование	460	-	-
Доходы будущих периодов	470	88 475	63 774
ИТОГО по разделу III	**490**	**90 183**	**67 643**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	127 748	263 524
Прочие долгосрочные обязательства	520	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**127 748**	**263 524**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	255	1 259
Кредиторская задолженность	620	34 981	70 148
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	5 837	4 353
перед покупателями и заказчиками	622	24 624	43 484
по расчету с персоналом по оплате труда	623	-	-
по прочим расчетам с персоналом	624	-	-
по налогам и сборам	625	162	46
по социальному страхованию и обеспечению	626	-	-
по лизинговым платежам	627	158	77
перед прочими кредиторами	628	4 200	22 188
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	600	-
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	-	-
прочая задолженность	632	600	-
Резервы предстоящих расходов	640	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	650	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**35 836**	**71 407**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**253 767**	**402 574**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	158	77
краткосрочная кредиторская задолженность	702	34 823	70 071

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	-	-
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	-	-
Материалы, принятые в переработку	003	-	-
Товары, принятые на комиссию	004	-	-
Оборудование, принятое для монтажа	005	-	-
Бланки строгой отчетности	006	-	1
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007	-	-
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008	-	-
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009	-	-
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	-	- 164
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011	84 279	173 544
Нематериальные активы, полученные в пользование	012	-	-
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	-	1
Потеря стоимости основных средств	014	-	-

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.

млн руб.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	**73 466**	**41 948**
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	11 270	6 438
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	**62 196**	**35 510**
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	-	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	53 659	32 758
Валовая прибыль (020-021-030)	040	8 537	2 752
Управленческие расходы	050	1 824	1 198
Расходы на реализацию	060	-	-
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	**6 713**	**1 554**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ Операционные доходы	080	120 747	11 516
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	36	374
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	120 711	11 142
В том числе: проценты к получению	091	88	55
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092	-	-
доходы от операций с активами	093	40	1 987
прочие операционные доходы	099	120 583	9 100
Операционные расходы	100	120 658	10 942
В том числе: проценты к уплате	101	-	-
расходы от операций с активами	102	40	1769
прочие операционные расходы	103	120 618	9 173
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	**120**	**53**	**200**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ Внереализационные доходы	130	**19 137**	**8 108**
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	21	1
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	19 116	8 107
Внереализационные расходы	150	23 765	8 008
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	**160**	**-4 649**	**99**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070±120±160)	**200**	**2 117**	**1 853**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	435	254
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)	**240**	**2 552**	**2 107**
Налог на прибыль	250	599	498
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	107	79
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	2	169
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**1 409**	**1 107**
Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	**310**	**-**	**-**
Прибыль (убыток) на акцию	**320**	**-**	**-**
Количество прибыльных организаций сумма прибыли	**330**	**1 1 409**	**1 1 107**
Количество убыточных организаций сумма убытка	**340**	**0 0**	**0 0**

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании	350	96	1	8	95
Прибыль (убыток) прошлых лет	360	-	-	-	-
Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств	370	-	-	-	-
Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте	380	18 994	23 381	8 099	7 758
Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности	390	-	-	-	-
Прочие доходы и расходы	400	26	383	-	155
ИТОГО	**500**	**19 116**	**23 765**	**8 107**	**8 008**

Дополнительная информация:
Количество акционеров, всего – 8, в том числе юридических лиц – 8.
Информация о дивидендах и акциях, задолженности (только в составе годового отчета):

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн рублей	211,35	166,05
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	140 900	276 750
Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. рублей	2 579,33	2 846,70
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	0	0
Просроченная дебиторская задолженность	млн рублей	2 253	0
Просроченная кредиторская задолженность	млн рублей	3	0

Среднесписочная численность работающих (человек) – 21.
Основные виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета) – **финансовая аренда (лизинг).**
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой баланс за отчетный год – 30.03.2010.
По итогам аудита, проведенного аудиторской организацией – СООО «Правильная компания» (лицензия на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0416446 выдана 24.04.2006 сроком действия до 23.04.2011) представленная бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Агролизинг» сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Агролизинг» на 01.01.2010 и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год, при этом совершенные ОАО «Агролизинг» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.